Шмат вершаў паэт прысвяціў сваім блізкім: бабулі Ульяне, дзеду, бацьку, асабліва маме, каханай жонцы, сваім дзецям і ўнукам. Максім Танк даражыў кожнай дробяззю, кожным імгненнем, звязаным са сваімі блізкімі.

Мы даследавалі больш за 100 вершаў Максіма Танка з розных этапаў яго творчасці. У выніку праведзенага даследавання маральна-этычных каштоўнасцей у паэзіі Максіма Танка былі зроблены наступныя высновы. З малалецтва чалавек як асоба фарміруецца ў сям'і. Станаўленне асобы паэта адбываецца на аснове прынцыпаў сямейнай педагогікі сям'і Скурко: гэта павага да свайго роду, бацькоў, вернасць сямейным традыцыям, радзіме.

**Г. Шпак**

## ЛІНГВАТЫПАЛАГІЧНЫЯ І НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ТЭМАТЫЧНАЙ ГРУПЫ «СВОЙСКІЯ ЖЫВЁЛЫ» Ў БЕЛАРУСКАЙ І АНГЛІЙСКАЙ ПАРЭМІЯЛОГІІ

Фразеалагічныя адзінкі адлюстроўваюць тыповыя сітуацыі і ўяўленні, стэрэатыпы культурна-нацыянальнай самасвядомасці ў сувязі з народнымі звычаямі, павер'ямі і традыцыйнымі ўяўленнямі пра з'явы асяроддзя. Вывучэнне фразеалагізмаў у межах кагніталогіі дазваляе знайсці крыніцу разумення кагнітыўных працэсаў, якія забяспечваюць фразеалагізацыю. Канцэпт «свойскія жывёлы» вывучаўся праз фразеалагічную базу англійскай і беларускай моў, было апрацавана 720 парэміялагічных адзінак.

Унікальнымі для беларускай мовы з'яўляюцца парэміялагічныя адзінкі, якія суадносяцца з народным календаром, напрыклад: *калі свіння не лажыцца, то гэта перад дажджом*; *калі карова пазірае ўверх і нюхае паветра – к дажджу*. Фразеалагізмы з кампанентам жывёлы апісваюць і народныя, а таксама царкоўныя святы: *мінулі Пакровы – заганяй у хлеў каровы*; *прыйшла Пакроўка – не дала малака кароўка*; *калі на Грамніцы нап'ецца певень са страхі вадзіцы, то на Юр'я вол наесца травіцы*; *калі на Аўдакея курыца з-пад страхі нап'ецца, то на Благавешчанне – вол.* Мы не знайшлі фразеалагізмаў з кампанентам 'свойская жывёла', якія б мелі дачыненне да народных святаў англічан, але ўнікальнай лічым адзінку, якая мае дачыненне да месяца мая, *O'Donohue's white horses* (у якой гаворыцца пра міфічнага правадыра О'Донаха на кані).

Уваходзячы ў канцэпт «свойскія жывёлы», апісаныя парэміялагічныя адзінкі дазваляюць глыбей зразумець карціну свету беларусаў і англічан, таму што сінтэзіруюць веды аб традыцыях, эталонах, звычаях і павер'ях народаў. Гэта можа тлумачыцца тым, што для гаспадароў розных культур дамашнія жывёлы маюць аднолькава важнае значэнне кармільца сям'і, асновы гаспадаркі, сувязі з маці-прыродай.